*Т.А.САПЕГА*

# АСНОЎНЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ МУЗЕЙНАГА ЭКСПАНАТА

Першаэлементам “музейнага універсума” з’яўляецца музейны прадмет, які выступае ў экспазіцыі ў якасці экспаната. Разуменне сутнасці і стварэнне дэфініцыі музейнага экспаната патрабуе адказу на наступныя пытанні: што ёсць экспанат як частка музейнай экспазіцыі? Якія яму ўласцівы спецыфічныя рысы? Адказ на іх патрабуе вызначэння адпаведнасці паміж паняццямі музейнага прадмета і музейнага экспаната. Належыць высветліць, ці з’яўляюцца гэтыя паняцці ідэнтычнымі, а калі не, то якія паміж імі адрозненні.

У сучаснай музеялогіі не існуе адзінага падыходу да азначэнняў музейнага прадмета і музейнага экспаната. Звычайна паняцце “музейны прадмет” выкарыстоўваецца толькі для арыгіналаў. Беларускі музеёлаг А.Калбаска, а таксама вядомыя прадстаўнікі замежнай музеялогіі (нямецкія музеёлагі Х.Кнор, Э.Страйхер, чэшскія музеёлагі Й.Бенэш, В.Влчак, З.Странскі, расійскія музеёлагі А.Разгон, В.Лысікава, П.Букшпан) адносяць да музейных прадметаў арыгінальныя носьбіты інфармацыі, якія ўключаюцца ў музейны збор шляхам адбору з рэчаіснасці і валодаюць прыметамі музейнасці. Некаторыя расійскія музеёлагі (В.Туманаў, В.Дукельскі) музейнымі прадметамі лічаць спецыяльна выробленыя для экспанавання макеты і ўзнаўленні музейных прадметаў.

У навучальным дапаможніку “Музеязнаўства. Музеі гістарычнага профілю” музейныя прадметы (арыгінальныя гістарычныя крыніцы) і ўзнаўленні музейных прадметаў вылучаюцца як асобныя віды экспазіцыйных матэрыялаў [4], і, такім чынам, праводзіцца мяжа паміж арыгінальнымі музейнымі экспанатамі і падрыхтаванымі да экспанавання копіямі музейных прадметаў.

Шэраг расійскіх музеёлагаў (А.Закс, Н.Фінягіна) уключаюць у лік экспанатаў як музейныя прадметы, так і іх узноўленыя копіі (у памеры і фактуры арыгінала ці ў іншым маштабе, матэрыяле і тэхніцы, што выкарыстоўваюцца ў экспазіцыі ў выпадку немагчымасці змяшчэння арыгінала) і навукова-дапаможны матэрыял. Расійская даследчыца А.Міхайлоўская адносіць да арыгінальных музейных экспанатаў мадэлі, макеты, муляжы і навуковыя рэканструкцыі арыгінальных помнікаў.

Арыгінальны музейны прадмет з’яўляецца галоўнай крыніцай эмацыянальнай рэакцыі наведвальніка. Непасрэдны кантакт з музейным прадметам дапамагае фарміраванню гістарычнай свядомасці чалавека, асэнсаванню свайго становішча ў сацыяльным часе і прасторы, сваёй сувязі з сучасным і будучым [5]. Сацыялагічныя даследаванні паказалі, што ў 44,8 % выпадках асноўнай падставай наведвання музея з’яўляецца арыгінальнасць музейных экспанатаў [6, с. 13]. Расійская даследчыца М.Юхвец лічыць, што адным з крытэрыяў ацэнкі экспазіцыі з’яўляецца тое, ці складаюць арыгінальныя помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры аснову экспазіцыі. Галоўную ролю арыгінальных экспанатаў у ажыццяўленні музейнай камунікацыі падкрэслівалі таксама А.Міхайлоўская, М.Гнядоўскі, Т.Стрыжэнава, А.Ломунава і інш.

Праблема неабходнасці выкарыстання ў экспазіцыі копій замест арыгіналаў вырашаецца самім музеем. Узнаўленне музейнага прадмета можа дакладна адпавядаць арыгіналу (памер, фактура, колер, тэхніка стварэння) і з’яўляцца яго “двайніком”. Яно можа быць выканана ў іншым маштабе, у іншай тэхніцы, але ўсё ж даваць уяўленне пра арыгінальны прадмет [4, с. 217]. Аднак лічым, што ўзнаўленне арыгінальных музейных прадметаў павінна быць абмежаваным, складаць выключэнне, а не з’яўляцца сістэмай.

Што датычыцца вызначэння аўтэнтычнасці музейнага прадмета, то гэта праблема таксама не вырашаецца адназначна. Польскі даследчык Ежы Свяцімскі сцвярджае, што ў розных музеях прынцып аўтэнтычнасці музейнага прадмета і экспаната інтэрпрэтуецца па-рознаму [6]. Польскі музеёлаг Войцех Глузінскі аналізуе шматлікія азначэнні музейнага прадмета рознымі даследчыкамі і прыходзіць да высновы, што аўтэнтычнасць як умова існавання музейнага прадмета і музейнага экспаната не падлягае дыскусіі. Аднак само значэнне аўтэнтычнасці пэўных тыпаў прадметаў патрабуе падрабязнага аналізу. Праблема аўтэнтычнасці прадмета ўзнікае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заўсёды ў вызначанай сітуацыі і вызначаных умовах, прычым пад увагу бяруцца пэўныя якасці прадмета, прызнаныя важнымі [8]. Напрыклад, што датычыцца прыродазнаўчых музеяў, то іх музейныя прадметы папярэдне падвяргаюцца пэўным працэсам прэпаравання, у выніку чаго іх першасная фізічная субстанцыя часткова змяняецца (могуць змяніцца фарба, форма, памеры і інш.), а некаторыя аўтэнтычныя часткі замяняюцца штучнымі.

Мы лічым, што, па-першае, паняцце “музейны прадмет” прымяняецца толькі да арыгінальных прадметаў. Узнаўленні музейных прадметаў (мадэлі, макеты, навуковыя рэканструкцыі і інш.) вызначаем як асобны від экспазіцыйных матэрыялаў і не ўключаем у паняцце “музейныя прадметы”.

Па-другое, на нашу думку, толькі музейны прадмет у экспазіцыйнай сферы функцыянавання выступае ў якасці экспаната. Узнаўленні музейных прадметаў мэтазгодна адносіць да экспазіцыйнага навукова-дапаможнага матэрыялу. На наш погляд, галоўная місія музея – дэманстрацыя арыгінальных носьбітаў інфармацыі. Таму трэба тэарэтычна падзяляць музейныя прадметы і іх копіі, а таксама музейныя экспанаты і экспазіцыйны навукова-дапаможны матэрыял. Гэта розныя прадметы па сваёй прыродзе і выкарыстанні.

Па-трэцяе, у розных музеях прынцып аўтэнтычнасці музейнага прадмета і экспаната можа інтэрпрэтавацца па-рознаму. Кожны музей у залежнасці ад багацця фонду і спецыфікі дзейнасці можа ўносіць свае карэктывы ў разуменне арыгінальнасці музейнага прадмета. Аднак такія акалічнасці разглядаем як выключэнні з правіла.

Гэта адносіцца ў першую чаргу да прыродазнаўчых музеяў. Але не толькі. Напрыклад, у мастацкіх музеях аўтэнтычнасць музейнага прадмета мае выключнае значэнне і з’яўляецца галоўнай умовай для ўключэння прадмета ў фонд і яго экспанавання. Кніга з арыгінальнымі літаграфіямі Напалеона Орды і факсімільнае выданне, што дакладна ўзнаўляе арыгінал, ніколі не будуць раўнавартаснымі. Аднак калі для мастацкага музея факсімільнае выданне будзе копіяй арыгінальных літаграфій, то для музея кнігі факсімільнае выданне з’яўляецца арыгіналам, бо разглядаецца як прадукт паліграфічнай дзейнасці.

Са зробленага аналізу вынікае, што паміж паняццямі “музейны прадмет” і “музейны экспанат” існуе пэўная суадноснасць. Экспанатам можа быць названы толькі экспануемы музейны прадмет. У гэтым сэнсе паняцце “экспанат” больш вузкае за паняцце “музейны прадмет”. Музейны прадмет можа часова выконваць ролю музейнага экспаната, а затым зноў “вяртацца” да першапачатковага стану – музейнага прадмета. Такім чынам, колькасна музейныя прадметы заўсёды маюць перавагу, бо экспанаваць усе музейныя прадметы адначасова практычна немагчыма. Разам з тым музейны экспанат мае шэраг якасных асаблівасцей.

Расійская даследчыца А.Міхайлоўская вызначае музейную экспазіцыю як “сукупнасць музейных прадметаў, падабраных па пэўнай сістэме для агляду”. Расійскі музеёлаг А.Закс у “Расійскай музейнай энцыклапедыі” экспанат вызначае як “прадмет, выстаўлены для агляду, базавы структурны элемент экспазіцыі”. З дадзеных азначэнняў вынікае, што паміж паняццямі музейнага прадмета і музейнага экспаната няма прынцыповай розніцы. Статус экспаната зводзіцца да функцыі музейнага прадмета, перанесенага з навуковага збору ў экспазіцыю. У такім выпадку экспанат сапраўды з’яўляецца толькі прэзентаваным музейным прадметам. Але экспанат, на нашу думку, валодае значна большымі якасцямі.

У адрозненне ад музейных фондаў у экспазіцыі прадметы звязаны ў першую чаргу тэматычна, а не на аснове ўласцівых ім якасцей (за выключэннем калекцыйнага паказу). Звычайна музейныя прадметы толькі адлюстроўваюць тэму, а не раскрываюць яе. Пры пераўтварэнні ў экспанат музейны прадмет рэалізуе свае музейныя характарыстыкі, якія былі выяўленыя ў ходзе навуковай апрацоўкі і падрыхтоўкі да экспанавання і не маглі праявіцца на стадыі “прадмета музейнага значэння”.

У экспазіцыі прадметы, аб’яднаныя ў комплексы, утвараюць адзіны цэласны твор, валодаюць новым культурным і гістарычным значэннем, што не зводзіцца да сумы якасцей асобных прадметаў. Экспазіцыя ў сучасным разуменні гэтага слова – не проста сукупнасць прадметаў, якія выстаўляюцца дзеля агляду. Спалучэнне музейных прадметаў арганізуецца ў прасторы з дапамогай загадзя створанага навуковага праекта. Акрамя гэтага, музейная экспазіцыя з’яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сінтэзам навукі і мастацтва і ажыццяўляецца з дапамогай архітэктурна-мастацкіх сродкаў [7, с. 6–7]. Музейная экспазіцыя трактуецца як своеасаблівы твор культуры, які ўключае ў сваю структуру элементы архітэктуры, мастацтва і мовы, твор, падпарадкаваны акрэсленай функцыі і адрасаваны да канкрэтнага спажыўца. Галоўнай характарыстыкай экспазіцыі з'яўляецца ўзаемадзеянне паміж рознымі элементамі [7, с. 7]. Экспазіцыя разглядаецца як сістэма, як сукупнасць яе складнікаў з адносінамі і сувязямі паміж імі, як цэласнае ўтварэнне, якое не можа быць простай сумай яго кампанентаў [1, с. 36].

Музеёлаг В.Глузінскі фармулюе паняцце "музейная сітуацыя". Ён мае на ўвазе сітуацыю, калі музейны прадмет выкарыстоўваецца ў розных якасцях і кожны раз набывае суб'ектыўную адзнаку. Музейная сітуацыя ўяўляе сабой комплекс з'яў, што складаюцца з уздзеяння архітэктурнай задумы музейнай экспазіцыі і створанай у ёй атмасферы; уздзеяння фізічнай рэчаіснасці музейнай экспазіцыі, якую складаюць экспанаты і тэхнічнае начынне экспазіцыі і якая з'яўляецца ненатуральна ізаляванай мадэллю натуральнай рэчаіснасці (прыроднай ці сацыяльнай), яе афармлення; пазіцыі наведвальніка [9, с. 353–355].

Прывядзём прыклад фарміравання і рэалізацыі музейнага значэння кнігі ў экспазіцыйных сітуацыях – экспазіцыях, розных па сваіх змесце, форме і задачах.

У фондзе музея кніга *"Statuta serenissimi domini Sigismundi primi Poloniae regis et magni ducis hithuaniae in conventibus generalibus edita et promulgata"* (Кракаў, 1524) – адна з еўрапейскіх кніг, выдадзеных у першай палове XVI ст. Па хparty храналагічнай прымеце кніга аднесена да калекцыі палеатыпаў і з'яўляецца кніжным помнікам гісторыі і культуры. Але толькі экспазіцыя дапамагае кнізе рэалізаваць свой змест і праявіць свае музейныя якасці.

У экспазіцыі, прысвечанай развіццю польскай кніжнай справы, кніга "Statuta…" раскрываецца як найбольш ранняя праява польскага кнігадруку, як кніга, выдадзеная знакамітым польскім выдаўцом эпохі Адраджэння Геранімам Ветарам. У экспазіцыі, прысвечанай развіццю заканадаўчай справы, кніга "Statuta…" адлюстроўвае заканадаўчыя акты Рэчы Паспалітай эпохі Рэнесансу. На выставе, прысвечанай беларускаму паэту-гуманісту Міколе Гусоўскаму, кніга "Statuta…" таксама ўвайшла ў лік экспанатаў. Але тут яна ўжо раскрылася як кніга, выдадзеная менавіта ў той друкарні, дзе годам раней убачыла свет кніга нашага земляка М.Гусоўскага "Песня пра зубра" (Кракаў, 1523).

Прыведзены прыклад яскрава ілюструе, што ў пазаэкспазіцыйнай сітуацыі кніга-музейны прадмет выступае выключна як матэрыял для навуковага да- следавання. У кожнай экспазіцыйнай сітуацыі музейны прадмет набывае новыя якасці. Экспанат – гэта прэзентаваны прадмет у экспазіцыйнай сітуацыі, створанай спецыяльна для яе. Пераўтварэнне музейнага прадмета ў музейны экспанат выводзіць музей за межы стварэння навуковай інфармацыі і ўцягвае ў стварэнне новага твора.

Такім чынам, лічым, што паняцце "экспанат" павінна быць патлумачана незалежна ад паняцця "музейны прадмет". Экспанаты, якія адначасова з'яўляюцца музейнымі прадметамі з вялікай колькасці магчымых варыянтаў прэзентавання музейнага прадмета, у экспазіцыі прадстаўлены ў адзіным з іх, валодаюць унікальнымі і часта непаўторнымі якасцямі. Здараецца, што ў экспазіцыйнай сітуацыі выяўляюцца такія якасці музейнага прадмета, якія былі скрытыя і не праяўляліся ў іншых экспазіцыйных умовах. Адбываецца гэта тады, калі прадмет пазнання настолькі звязаны з экспазіцыйнай сітуацыяй, што па-за створанымі экспазіцыйнымі ўмовамі прадмет ужо так не праяўляе сябе [10, с. 363–364].

Музеёлаг Е.Свяцімскі прапануе не ідэнтыфікаваць экспанат з прэзентаваным ў экспазіцыі прадметам. Новыя рысы, прэзентаваныя праз музейныя прадметы ў экспазіцыйнай сітуацыі, з'яўляюцца на грунце так званых "выглядаў", якія набываюць прадметы ў экспазіцыі. Гэтыя "выгляды" заўсёды падпарадкаваны эстэтычнаму ўспрыманню. Незалежна ад функцыі, якую выконвае прадмет у экспазіцыі (напрыклад, перадача навуковага зместу), музейны прадмет заўсёды паўстае ў экспазіцыі як прадмет эстэтычнай перцэпцыі. Незалежна ад таго, узбуджаюць "выгляды" прадмета эмоцыі ў наведвальніка або не (наведвальнікі таксама бываюць розныя), яны з'яўляюцца вельмі важнымі. Дзякуючы ім, кожны прэзентаваны ў экспазіцыі прадмет праяўляе сябе інакш, чым ў пазаэкспазіцыйнай ці нават ў іншай экспазіцыйнай сітуацыі. Дасягненні сучаснай экспазіцыйнай практыкі дазваляюць здабыць нават з неатракцыйных экспанатаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

візуальныя якасці, якія не праяўляліся ў першасных умовах. Такія створаныя “выгляды” прадметаў уносяць у экспазіцыю моманты адкрыццяў і творчасці.

Аналізуючы шматлікія падыходы да музейнага экспаната, вылучым наступныя асноўныя ўласцівасці музейнага экспаната:

1) перадае інфарамацыю, навуковыя веды, часта загадзя падрыхтаваныя і маючыя ў экспазіцыі навучальны характар;

2) рэалізуе здольнасці прыцягваць увагу, эмацыянальна ўздзейнічаць на наведвальніка (атракцыйнасць і экспрэсіўнасць);

3) мае часавую абмежаванасць у існаванні;

4) знаходзіцца ў спецыфічных умовах – фізічнай рэчаіснасці музейнай экспазіцыі, якую складаюць экспанаты, тэхнічнае начынне і афармленне экспазіцыі;

5) у экспазіцыі мае з іншымі прадметамі адносіны, якія адрозніваюцца ад адносін у фондасховішчы (акрамя калекцыйнага паказу);

6) атрымоўвае суб’ектыўную адзнаку (як з боку экспазіцыянера, так і з боку наведвальніка).


1. *Арзамасцев В.П.* О семантической структуре музейной экспозиции // Музееведение. На пути к музею XXI века: Сб. науч. тр. / АН СССР, НИИ культуры; Редкол.: Н.А.Никишин и др. – М., 1989. – С. 35–49.

2. *Дукельский В.Ю.* Музейный предмет // Российская музейная энциклопедия: В 2 т. / Рос. ин-т культурологии МК РФ и РАН; Редкол.: В.Л.Якин (пред.) и др. – Мн.: Прогресс: РИПОЛКлассик, 2001. – С. 405.

3. *Михайловская А.И.* Музейная экспозиция (организация и техника) / Под ред. Ф.Н.Петрова и К.Г.Митяева. – 2-е изд., доп. – М.: Сов. Россия, 1964. – 518 с.: ил.

4. *Музееведение.* Музеи ист. профиля: Учеб. пособие для вузов по спец. «история» / И.Аве и др.; Под ред. К.Г.Левыкина, В.Хербота. – М.: Высш.шк., 1988. – 430 [1] с.: ил.

5. *Музейная* педагогіка. Праблемы арганізацыі работы з дзецьмі: Навук.-метад. зб. / Бел. ін-т праблем культуры; Уклад. В.У.Мірончык. – Мн.: БелІПК, 1997. – 70 [1] с.: іл. – (Музейныя сшыткі)

6. *Научное* проектирование и художественное оформление музейной экспозиции: Метод. рек. / Гос. музей БССР; Сост. Д.Н.Шимук, Ф.М.Каплан. – Мн., 1990. – 16 [2] с.

7. *Сташкевіч А.Б.* Стварэнне музейных экспазіцый. Этап навуковага праектавання // Навуковае праектаванне музейных экспазіцый: Навук.-метад. зб. / Бел.ін-т праблем культуры; Уклад. А.Б.Сташкевіч. – Мн., 1996. – Вып. 1. – С. 6–16.

8. *Głuziński W.* Muzeum – przedmiot muzealny. Podstawowe pojęcia muzeologii // Z problematyki badań nad działalnością oświatową muzeów: Materiały z okazji 9-tej konferencji generalnej ICOM, Paryż, 1971 / Polski Komitet Narodowy ICOM. Muzeum Narodowe w Poznaniu; Red. K. Malinowski. – Poznań, 1971. – (Monografie Muzeum Narodowego w Poznaniu. T. 6). – S. 36–68.

9. *Głuziński W.* U podstaw muzeologii. – Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1980. – 452 s.

10. *Świecimski J.* Ekspozycja muzealna jako przedmiot poznania i działania twórczego // Rocznik historii sztuki. – 1984. – T. 14. – S. 351–374.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ